лізаваных краін свету адлюстроўваюць хуткае ўзрастанне ролі сацыяльнай педагогікі. Адным з напрамкаў дзейнасці служб сацыяльнай дапамогі насельніцтву з'яўляецца сфера экалогіі. Дзейнасць педагога-эколага вельмі важная і шматгранная. 1989 год адкрыў дзесяцігоддзе, аб'яўленае Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый сусветным дзесяцігоддзем адукацыі ў галіне навакольнага асяроддзя. Значнасць гэтага факта ў тым, што ўвага ўсіх жывучых на зямлі звернута да праблемы, якая не цярпіць адкладання ў сур'ёзным падыходзе да яе вырашэння, патрабуе ўдзелу ўсяго чалавецтва ў прадухіленні пагражальнай катастрофы.

Спрыяльныя ўмовы ў гэтай галіне ў значнай ступені залежаць ад працы выхаваўча-адукацыйных устаноў, у тым ліку сацыяльна-педагагічных комплексаў.

Педагог-эколаг у сваёй працы выкарыстоўвае разнастайныя метады выхавання і адукацыі: назіранне, дэманстрацыйныя вопыты, лекцыі, дыскусіі, праекты і эксперыменты, разнастайныя формы агітацыйна-масавай работы.

Вельмі важным і эфектыўным, на наш погляд, сродкам экалагічнага выхавання дзяцей і падлеткаў з'яўляецца гульня. Гульнявая дзейнасць дзяцей уключае многа іншых відаў дзейнасці і таму з'яўляецца універсальнай. Асабліва важна тое, што дзеці ўдзельнічаюць у гульнях без прымусу, з ахвотай і цікавасцю. Педагагічна правільнае кіраванне гульнявой дзейнасцю дазваляе пашырыць кругагляд дзяцей, зацікавіць іх прыродаахоўнымі справамі, дапамагае выхоўваць у дзецях пачуццё адказнасці за становішча роднай прыроды.

Сумесна с Рэспубліканскім дзіцячым экалагічным цэнтрам намі распрацавана багатая і разнастайная экалагічная гратэка, якая мае класіфікацыю ў залежнасці ад педагагічнай мэты кіраўніка, узроставых асаблівасцей вучняў, іх інтарэсаў і захапленняў. У гратэцы – экалагічныя конкурсы і спаборніцтвы, віктарыны, завочныя падарожжы ў краіну раслін і жывёл, ролевыя гульні, экалагічныя юмарыны, дыдактычныя і рухомыя гульні, атракцыёны. Вялікім поспехам у дзяцей старэйшага ўзросту карыстаюцца сучасныя шоу-праграмы "Экалагічнае поле цудаў", "Шчаслівы выпадак", "Пяць зорак", "Папараць-кветка" (таксама па экалагічнай тэматыцы).

Распрацоўваючы новыя праграмы па экалагічнаму выхаванню вучняў, педагог-эколаг павінен памятаць, што ў гульнявой дзейнасці раскрываюцца найлепшыя якасці дзіцяці, развіваюцца калектывізм, працаздольнасць, актывізуюцца інтэлектуальныя здольнасці, эмацыянальныя пачуцці.

**Сямёнава А.І.,**
**выкладчык**

## ТЭАТРАЛІЗАЦЫЯ ЯК ТВОРЧЫ МЕТАД У ПРАЦЭСЕ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ НАД МАСТАЦКІМ НУМАРАМ

Нягледзячы на ўзрастаючую ролю тэатралізацыі, тэорыя яе распрацоўкі недастатковая, таму сёння няма адзінага разумення сутнасці тэатралізацыі. У сваю чаргу нераспрацаванасць тэарэтычных пытанняў тэатралізацыі адмоўна адбіваецца на практычнай дзейнасці студэнтаў.

Найбольш распаўсюджанай памылкай нашых выпускнікоў у час работы з'яўляецца разуменне тэатралізацыі як элемента мастацкасці, г.зн. прыўнясенне ў нумар мастацкага матэрыялу (песень, музыкі, жартаў, урыўкаў са спектакля).

Другой распаўсюджанай памылкай з'яўляецца падыход да тэатралізацыі як да прыёму адлюстравання. Чытаецца аўтарскі тэкст (верш, байка), а група ўдзельнікаў спрабуе ўсё па сюжэту паказаць.

Трэцяя памылка заключаецца ў наступным. Арганізатар адпачынку імкнецца тэатралізаваць усё разам. Тэатралізацыя такога роду, калі гучна і часта гучыць музыка, калі да месца і не да месца чытаюцца вершы, пазбаўляе масавую культурна-асветніцкую работу яе сацыяльна-педагагічнай глыбіні.

Мы назвалі некаторыя памылкі, якія маюцца ў працэсе навучання па курсу "Работа над нумарам". Цяпер паспрабуем даць азначэнне, што такое тэатралізацыя і як падыходзіць да работы над ёй.

Тэатралізацыя можа быць прыменена не заўсёды, а толькі ў асаблівых умовах, калі патрабуецца асэнсаваць незвычайнае значэнне той ці іншай падзеі, выказаць свае пачуцці ў адносінах да яе. Такім чынам, тэатралізацыя - гэта не звычайны прыём у сацыяльна-педагагічнай дзейнасці, а складаны творчы метад, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мае глыбокае абгрунтаванне і найбольш блізка стаіць да мастацтва.

Зразумела, мала толькі бачыць прадмет тэатралізацыі, трэба ўмець і арганізаваць яго. Тут важнейшым інструментам выступае вобразнасць, якая складае сутнасць тэатралізацыі і дазваляе паказаць у дзеянні той ці іншы факт, здарэнне, эпізод.

Пытанне аб вобразнасці мастацкай прапаганды не новае. Яшчэ А.В.Луначарскі заклікаў пранізаць мастацтвам усю работу ў масах, выкарыстоўваць усе магчымасці такой як арганізацыі, каб уздзейнічаць на людзей не разважаннямі, а жывым паказам жыцця ў вобразах. У гэтых словах адлюстроўваецца сутнасць тэатралізацыі, пры якой мы маем магчымасць не расказваць аб якой-небудзь падзеі з жыцця, а паказаць, ажывіць гэтую падзею на сцэне такой, якая яна была ці ёсць.

Вобразнасць рэальная і мастацкая - гэта аснова тэатралізацыі. Яна дапамагае пабудаваць унутраную сцэнарную логіку і адабраць сродкі мастацкай выразнасці.

Калачова І.І.,
аспірантка

## МЕСЦА ТРАДЫЦЫЙНАГА СЯМЕЙНАГА ВЫХАВАННЯ БЕЛАРУСАЎ У ПАДРЫХТОЎЦЫ САЦЫЯЛЬНЫХ ПЕДАГОГАЎ

Праблема традыцыйнага сямейнага выхавання беларусаў у падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў мае, на нашу думку, выключнае значэнне: зґублены ўяўленні аб народных сродках, метадах, прыёмах выхавання, адсутнічаюць дасканалыя веды аб гісторыі сям'і, яе радаводзе, генатыпе, абвастраецца "вечны" канфлікт паміж бацькамі і дзецьмі, застаюцца нявырашанымі вельмі вострыя сацыяльныя пытанні. Менавіта грунтоўнае вывучэнне гэтых праблем, распрацоўка метадаў навуковага кіравання з'явамі, якія разбураюць сям'ю і яе традыцыі, з'яўляюцца важнымі задачамі ў падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў.

Чаму патрэбна ведаць традыцыйныя прыёмы сямейнага выхавання, якімі жывілася сям'я?

У беларускай сям'і існавалі традыцыі, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Яны мацавалі сям'ю, яе звычаі. Галоўнай жыццёвай каштоўнасцю сям'і з'яўляліся дзеці. "Нашто той клад, калі дзеткі ідуць у лад", - сведчыла народная мудрасць. Сёння сцвярджэнне, што "дзеці - гэта кветкі", застаецца вельмі абстрактным. Існуе шмат прыкладаў несправядлівых, абразлівых адносін да дзяцей. Тэрміны "пакінутыя дзеці", "маці-зязюля" і іншыя нарадзіліся ў наш час. Унутрысямейныя і знешнесямейныя адносіны і стасункі ў беларускай сям'і мацаваліся працоўнымі, маральнымі, эстэтычнымі, фізічнымі, разумовымі традыцыямі, якія жывіліся мудрасцю народнай педагогікі. Дзеці выконвалі народныя запаветы, напрыклад такія: "Нельга не працаваць, калі працуюць маці і бацька", "Нельга рабіць таго, што асуджаюць старэйшыя" і інш. Сістэма ўнутрысямейных маральных правілаў і законаў амаль знішчана. Стасункі паміж бацькамі і дзецьмі засноўваюцца па прынцыпу: "Мне патрэбна, я хачу".

У традыцыйнай беларускай культуры чалавек лічыўся асобай толькі тады, калі ён быў працавітым. Бацькі - люстэрка працоўнага выхавання. "Якое семя, такое і племя", "Які куст, такі і адростак". Звычкі выконваць хатнюю працу, дапамагаць старэйшым, нешта майстраваць, рамантаваць у шматлікіх сем'ях з'яўляліся галоўнымі.

У беларускай сям'і вылучалася традыцыя выхавання дачкі - маці ("Якая дошка, такая і стружка, якая маці, такая і дачушка"), сына - бацькам ("Якое дрэва, такі і клін, які бацька, такі і сын"). Гэта адметнасць праяўлялася ў працоўным выхаванні. З 7-8 год маці вучылі дзяўчынак прасці, шыць, вязаць, вышываць, гатаваць ежу. З 14-15 год пачыналі сабіраць пасаг, які дзяўчынкі рыхтавалі з дапамогаю маці. Бацька вучыў сына галоўным відам мужчынскай працы: араць, сеяць, касіць, рамантаваць надворныя пабудовы і інш. Сучасныя бацькі з-за вытворчай занятасці, бытавых праблем і па іншых прычынах мала ўдзяляюць часу дзецям.

У беларускай сям'і былі вельмі значнымі ролевыя функцыі. Усе ведалі, што бацька - гэта гаспадар, здабытчык. Бацька не толькі патрабаваў парадку ў сям'і, але і сам быў прыкладам добрасумленнасці, справядлівасці. Маці - гэта перш за ўсё выхавацелька сваіх дзяцей. Павага да маці лічылася самым важным маральным запаветам дзяцінства. Выхаванасць дзяцей вымяралася іх уменнем клапаціцца аб старой маці, яе здароўі і дабрабыце. У сучаснай сям'і ролі змяніліся. Часта маці з'яўляецца і гаспадаром, і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ